К. Крапіва супраць тэорыі бесканфліктнасці – звыроднага нараджэння неразумнай палітыкі ўладаў у вобласці мастацкай творчасці. Паслядоўнай прынцыповасцю вызначаліся яго выступленні па праблемах беларускай мовы. І багаты «іканастас» узнагарод: Герой Сацыялістычнай Працы, чатыры ордэны Леніна, ордэны Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонага Сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, Дружбы народаў – адзнака не грамадзянскай рахманасці, пакорлівасці ўладам, а прызнанне вялізарных заслуг пісьменніка перад нацыянальнай культурай. Сваё амаль стогадовае жыццё ён прысвяціў служэнню Айчыне і быў бязмерна шчаслівы, калі яго асабістае патрыятычнае парыванне супадала з палітыкай дзяржавы, хоць у нечым карэктуючы яе. На добры лад!

*Смолік А.І.,*
*БДУКМ, Мінск*

## МЕЦЭНАЦТВА ЯК ФАКТАР РАЗВІЦЦЯ ПРАФЕСІЙНАЙ МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ

Тэарэтычнае і практычнае даследаванне трансфармацыі сучаснай сацыяльна-культурнай сферы Беларусі сведчыць аб карэнных зменах у яе інфраструктуры. У 1990-х гадах істотна змяніліся ўмовы ўмовы стварэння, захавання, трансляцыі і засваення культурных каштоўнасцей. Крызісная сітуацыя негатыўна паўплывала на крыніцы фінансавання сферы культуры.

Сродкі, якія выдаткоўваліся на развіццё культуры складалі невялікую долю ад бюджэта краіны. Так, у 1990 г. яны складалі 0, 67%, 1991 – 0,78; 1992 – 0,84; 1993 – 1,9; 1994 – 1,5; в 1995 г. – 0,6% [6]. Доля выдаткаў на культуру з рэспубліканскага бюджэту ў 2004–2014 гг. стабільна складала 1,5% расходнай часткі, ці 0,5% валавога ўнутраннага прадукту [1, 8].

Такім чынам, эканамічны крызіс, які ахапіў беларускае грамадства адмоўна адбіўся на фінансаванні і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні культурнай сферы. Недахоп грашовых укладанняў у сацыякультурную сферу з боку дзяржавы суб'екты культуры імкнуліся кампенсаваць за кошт такой развітай у мінулыя стагоддзі формы падтрымкі культуратворчасці асобы, як мецэнацтва. У Беларусі ў XVIII–XIX стст. беларуская магнатэрыя ўкладала ўласныя сродкі ў развіццё архітэктуры, выяўленчага, музычнага, тэатральнага, дэкаратыўна-прыкладного мастацтваў. Мэцэнаты імкнуліся падтрымаць сістэму адукацыі і навуку. Аб гэтым сведчыць дзейнасць прадстаўнікоў графскага роду Тышкевічаў.

Пераважная большасць з іх прытрымліваліся асноўнага прынцыпа мецэнацтва, сфармуляванага ў ХУІ ст. Францыскам Скарынай. Асветнік-гуманіст заклікаў пануючыя колы аддаваць сябе цалкам і поўнасцю «розмножению мудрости, умения, опатренности, розуму и науки», не шкадуючы «всякого тружания и скарбов» [4, с. 135]. Кіруючыся гэтым запаветам мысліцеля эпохі Адраджэння, Граф Бенядзікт Эмануіл і яго жонка грфіня Ванда Ванькові

ахвяравалі шмат уласных сродкаў на падтрымку таленавітых творцаў. Так, А.Д. Жамет (1821–1877 гг.) атрымаў ад іх значныя грашовыя сродкі для ўдасканалення майстэрства жывапісу ў Італіі. Нарадзіўся Альберт Жамет у Вільні ў сям'і небагатага мяшчаніна. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Віленскай гімназіі, потым у якасці волнага наведавальніка займаўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Пад кіраўніцтвам прафесара М.М. Вараб'ёва асвойваў тэхніку жывапісу. Бенядзікт Эмануіл сачыў за творчасцю А. Жамета і імкнуўся дапамагчы творцу развіваць прыродныя задаткі і навыкі жывапісу, атрыманыя ў акадэміі. Граф прапанаваў таленавітаму мастаку паехаць у Еўропу да знакамітых майстроў жывапісу, каб пазнаёміцца з іх творчасцю. На сродкі Тышкевіча мастак 12 гадоў жыў у Англіі, Германіі, Італііі, Францыі, дзе вучыўся ў лепшых тагачасных пейзажыстаў. Менавіта там ён стварыў знакамітыя палотны: «Від на возера Немі», «Тіволі і яго вадаспады», «Від у Рока-дзі-Папа», «Рымскі Калізей». За палатно «Від на возера Немі» мастак атрымаў прэмію ад Рымскай акадэміі св. Лукі (1854 г.). Карціна «Тіволі і яго вадаспады» была высока ацэнена Санкть-Пецярбургскай акадэміяй мастацтваў, за яе А. Жамету было нададзена званне некласнага мастака. За цыкл твораў, створаных у Еўропе, А. Жамету ў 1859 г. было нададзена высокае званне акадэміка. Думаецца, у гэтым ёсць пэўная заслуга яго высакародных мецэнатаў Бенядзікта і Ванды Тышкевічаў. Удзячны мастак падараваў Тышкевічам самы лепшы свой твор «Рымскі від», які аздобіў іх ўнікальную карцінную галерэю, дзе былі палотны Леанарда Да Вінчы, П. Рубенса, Фра Барталамео, Я. Матэйкі і інш.

У 1864 г. славуты мастак вяртаецца ў Вільню, дзе да канца свайго жыцця быў дэкаратарам віленскага гарадскога тэатра. Шэраг твораў жывапісца экспануюцца сёння ў вядомых мастацкіх галерэях свету. Напрыклад, карціну А. Жамета «Арко-Скуро и разные виды виллы Бутера, в Палермо» сёння можна ўбачыць у Эрмітажы

Дабратворны ўплыў мецэнацкай дзейнасці графа Б. Э. Тышкевіча адчуў на сабе беларускі кампазітар Фларыян Фабіянавіч Міладоўскі (1819-1889 гг.), які па праву лічыцца адным з заснавальнікаў айчыннай прафесійнай музычнай культуры. Граф у 1836 г. запрасіў яго ў Чырвоны двор у якасці настаўніка музыкі для сваіх дачок. Сам Б. Тышкевіч быў таксама аматарам класічнай музыкі і марыў аб стварэнні ўласнага сімфанічнага аркестра. Ён падзяліўся сваімі думкамі з Фларыянам, які горача падтрымаў ідэю графа і выказаў жаданне стаць дырыжорам аркестра. З мясцовых і нямецкіх музыкаў у хуткім часе маладому дырыжору ўдалося ўкамплетаваць склад аркестра, падабраць для яго цікавы рэпертуар і дабіцца высокага выканальніцкага ўзроўню. Музыказнаўцы сведчаць, што аркестр пад кіраўніцтвам Міладоўскага за кароткі час зрабіўся адным з лепшых сімфанічных калектываў Еўропы. Аркестр бездакорна выконваў выконваў сімфоніі Бетховена, Моцарта, Шуберта, тагачасныя новыя творы сімфанічнай і інструментальнай музыкі. Кампазітар і сам стварыў для аркестра шэраг буйных музычных твораў. Для музычнага тэатра, які існаваў у Чырвоным двары, Ф. Міладоўскі напісаў некалькі аперэт. Граф і графіня Тышкевічы маральна і матэрыяльна заахвочвалі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

творчую дзейнасць беларускага кампазітара, якая працягвалася да 1841 г. [3]. З мэтай удасканалення кампазіцыйнага майстэрства Тышкевічы прапанавалі кампазітару паехаць у Еўропу да лепшых тагачасных кампазітараў і выканаўцаў. Два гады на іх сродкі браў Міладоўскі ўрокі па гармоніі і паліфоніі ў Ф. Хельтцля і С. Зехцера, па вакалу і контрпункту ў І. Фішхофа [9].

У 1843 г. Ф. Міладоўскі вяртаецца ў Чырвоны двор. Тышкевічы з радасцю сустрэлі таленавітага творцу і стварылі спрыяльныя ўмовы для яго далейшай творчасці.

З Чырвоным дваром звязана навуковая, асветніцкая, мастацкая і мецэнацкая дзейнасць унука Бенядзікта Эмануіла – Бенядзікта Генрыха Тышкевіча (1852–1935 гг.), якому па спадчыне перайшоў палаца-паркавы ансамбль. Нарадзіўся ён па звестках тышкевічазнаўцаў у Лагойску, але дзяцінства яго прайшло ў Чырвоным двару. У Тышкевічаў тут была цудоўная бібліятэка і хлопчык рана палюбіў кнігі, асабліва ён захапляўся творамі аб вялікіх геаграфічных адкрыццях, экзатычных краінах. Пад уплывам такой літаратуры ў яго выспявала трывалае імкненне самому здейсніць вандроўку ў краіны іншых кантынентаў. Першая краіна, якую Бенядзікт у дзяцінстве наведаў разам з дзядзькам была Францыя. Вандроўка па гістарычна-культурных помніках Францыі ўмацавалі яго мару. Як толькі Б.Г. Тышкевіч дасягнуў паўналецця і змог самастойна распараджацца фінансавымі сродкамі ён пачаў ажыццяўляць сваю мару.

Напачатку вандроўнік наведаў Германію і Італію, але няўрымслівага графа вабілі краіны Азіі, Амерыкі, Афрыкі. Пабудаваўшы на ўласныя сродкі у 1875 г. судна «Жэмайція», якое, дарэчы, на Сусветнай выставе ў Парыжы (у гонар выставы была збудавана Эйфелева вежа) атрымала залаты медаль, Бенядзікт Генрых пачынае марскія вандроўкі па свету. Ім былі выдаткаваны вялікія сродкі для здзяйснення шэраг марскіх археалагічных экспедыцый у Індыю, Кітай і Японію. Адкуль яе ўдзельнікі прывозілі вельмі каштоўныя для навукі археалагічныя калекцыі, мноства фотаздымкаў.

Паспяховыя марскія экспедыцыі на Далёкі Усход выклікалі жаданне здейсніць марское падарожжа вакол свету. Засвоіўшы навігацыйныя інструкцыі, пазнаёміўшыся з месцам знаходжання маякоў свету, набыўшы неабходнае абсталяванне і падабраўшы экіпаж з 40 вопытных мараходаў, граф адправіўся ў падарожжа вакол свету. Безумоўна, прайсці марскім шляхам вакол Зямлі Б. Тышкевічу і яго аднадумцам удалося б, але ў гэты час пачаўся рускатурэцкі канфлікт. ВКЛ жа ўваходзіла ў склад Расійскай імперыі і экіпаж туркамі ўспрымаўся як варожы. Таму наведаўшы Крым і Алжыр, граф вымушаны быў спыніць падарожжа [2].

Б. Тышкевіч не толькі вандраваў сам, але садзейнічаў здзяйсненню марскіх падарожжаў іншым. Напрыклад, ён аказаў фінансавую і арганізацыйную дапамогу яхтсмену С. Рагазінскаму, які ажыццявіў першую польскую марскую навуковую экспедыцыю. Падарожнік у знак удзячнасці назваў імем Тышкевіча возера Мбу ў Камеруне [7, с. 68].

Вядомымі мецэнатамі ў XIX ст. былі Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы ў 1856 г. ахвяравалі Віленскаму музею старажытнасцей уласную бібліятэку



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(3 тыс. кніг), археалагічную калекцыю з 2 тыс. адзінак. Браты на ўласныя сродкі пабудавалі чатыры судны для навуковай экспедыцыі ўздоўж ракі Віліі, пад час якой быў сабраны багаты этнаграфічны, фальклорны і археалагічны матэрыял.

На сродкі Юзафа Тышкевіча ў Валожыне ў 1815 г. быў ўзведзены мураваны велічны касцёл св. Юзафа ў стылі класіцызму. Ён жа быў фундатарам Валожынскага палаца, помніка архітэктуры класіцызму. Касцёл і палац да сённяшняга часу з'яўляюцца галоўным планіровачным элементам горада.

У Лагойску Тышкевічы збудавалі дзве ўніяцкія і дзве праваслаўныя царквы, Аляксандр і Вікенцій Тышкевічы на працягу шасці гадоў (1787–1793 гг.) фінансавалі будаўніцтва мураванага касцёла Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі і святога Казіміра. Уладальнікамі Лагойска заснаваны фабрыкі льняных і баваўнавых вырабаў, шкляны завод, ліцейнае прадпрыемства, цукровы завод, крэдытны банк.

Мецэнатамі з'яўляліся Тышкевічы, якія гаспадарылі ў Свіслачы. Тадэвуш, Казімір і Вікенцій на працягу XVII–XVIII стст. ператварылі невялікае мястэчка ў сапраўдны прамысловы і культурны горад. У ходзе рэканструкцыі мястэчка ў ім з'явілася рынчная плошча з фарным касцёлам, ўніяцкай царквой, вежай з гадзіннікам і «кафэнгаўзам». Графам Вікенціем быў закладзены парк і заапарк. У 1880-х гг. быў узведзены будынак для тэатра, дзе ставіліся балеты і музычныя сцэны. Усе прафесійныя трупы, якія прыязджалі ў Свіслач, В. Тышкевіч браў на свае ўтрыманне, плаціў акцёрам грошы, лепшых узнагароджваў каштоўнымі падарункамі.

У 1805 г. граф В. Тышкевіч на свае сродкі заснаваў у Свіслачы гімназію, якую ў розныя часы скончылі С. Горскі, Ю. Крашэўскі, Н. Орда, Р. Траўгут. Гаспадар Свіслачы выдаткаваў для гімназіі 1000 злотых і будынкі, на яе развіццё завяшчаў 30 тыс. рублёў срэбрам. Граф матэрыяльна падтрымліваў настаўнікаў, якім не хапала пакояў у будынках гімназіі, выдзяляючы ім грошы на наёмнае жыллё. Бяднейшыя навучэнцы таксама атрымлівалі дапамогу для найму пакояў. З графскага маёнтку ў гімназію пастаўлялася паліва [5, с. 47–48].

Увогуле гістарычны вопыт развіцця айчыннай культуры сведчыць, што яе высокі ўзровень дасягнуты ў мінулыя стагоддзі, дзякуючы мецэнацкай дзейнасці беларускай магнатэрыі, да якой належылі і прадстаўнікі графскага роду Тышкевічаў. На гэтай высакароднай традыцыі, на наш погляд, павінны адраджацца сучасныя формы мецэнацтва. Прыкладна два працэнты ад дзяржаўнага гадавога бюджэту далёка не задавальняюць сённяшнія патрэбы сферы культуры.

---


1. Беларуская культура, 2014: стан, тэндэнцыя і перспектывы развіцця / Мін-ва культуры Рэспублікі Беларусь, Ін-т культуры Беларусі; уклад.: Гуляева А.Р., Лапцёнак І.Б.; рэдкал.: Святлоў Б.У. (старш.) і інш.; прадм. Б.У. Святлова. – Мінск: Інбелкульт, 2015. – 419 с.

2. Гловацкий, В. Увлекательный мир парусов: Очерки по истории парусного спорта / В. Гловацкий; пер. с пол. Л. Васильева, В. Кона. – М.: Прогресс, 1981. – 312 с




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Капилов, А.Л., Ахвердова, Е.И. Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX веков / А.Л. Капилов, Е.И. Ахвердова. – Минск: Институт современных знаний, 2000. – 144 с.: ил. 13.

4. Конан, У.М. Скарына (Скарыніч) Францыск [Францішак; 1490 (?) – 1551 (?)] / У.М. Конан, С.А. Падокшын, І.А. Юхо // Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыкл. даведнік / Беларус. Энцыкл.; Гал. рэд. «Беларус. Энцыкл»: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 1995. – С. 123–137.

5. Патоцкі, Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану / Л. Патоцкі; укл., прадм., камент. А.М. Філатавай; пер. з пол. І.У. Саламевіч. – Мінск: Полымя, 1997. – 270 с.

6. Республика Беларусь в цифрах – Republic of Belarus in figures: крат. Справ. / Мин-во статистики и анализа Республики Беларусь. – Минск: Информстат, 1999. – 94 с.

7. Сакалова, В.М. Палац як семіятычны кампанент магнацкай культуры (на прыкладзе маёнткаў Тышкевічаў) / В.М. Сакалова // Рэпрэзентацыя і музеефікацыя творчай спадчыны Тышкевічаў у Беларусі і Літве: Пятыя міжнар. Тышкевіцкія чытанні, Мінск, Крэцінга, 14–15 мая 2014 г.: манагр. зб. / Мін-ва культуры Рэспублікі Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; Kretingos muzeijus grafu Tiskevicu dvare. – Мінск: БДУКМ, 2014. – 183 с.

8. Статистический ежегодник Республики Беларусь, 2005 = Statistical Yearbook of the Republic of Belarus, 2005 / М-во статистики и анализа Респ. Беларусь.– Минск., 2005. – 609 с.

9. Echo Myzeczne, Teatralne I Artystyczne. – 1980. – № 312. – S. 449.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Салееў В.А.,*
*БДАМ, Мінск*

## МАСТАЦКІ КРЫТЫК ЯК ТВОРЧАЯ АСОБА

У сістэме мастацкай крытыкі ёсць постаць, якая карыстаецца павагай сярод дзеячоў культуры і мастацтва, але якую ніхто не любіць.

Гэта мастацкі крытык. Існуе сотні апавяданняў і прытчаў (звычайна яны належаць, як след, мастакам розных сфер мастацкага дзеяння) наконт гэтай дзіўнай істоты. Мастакі, якія не вельмі абцяжараныя асабістай культурай, проста прапануюць крытыку самаму паспрабаваць сябе ў мастацкай творчасці. Маўляў, тады і атрымаеш права судзіць. Але і вялікія творцы – Б. Шоу, выбітныя кінарэжысёры Ф. Феліні, І. Бергман – хто з гумарам, а хто і з пэўнай ступенню адчужанасці, прадстаўляе постаць крытыка ў зніжаным выглядзе. Выдатны кампазітар І. Стравінскі, наогул сцвярджае, што ён ніколі не бачыў помніка аніводнаму мастацкаму крытыку…

Але без гэтай дзіўнай постаці, без гэтага дзіўнага феномена – мастацкай крытыкі, не існуе якаснага мастацкага працэсу і мастацкай жыццядзейнасці наогул.